Бх 65.895

ДЗЯРЖАУНАЯ БІБЛІЯТЭКА БССР ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЦК ЛКСМ БЕЛАРУСІ

*У дапамогу масавым бібліятэкам БССР*

# ДА 40-годдзя ЛЕНІНСКАГА КАМУНІСТЫЧНАГА САЮЗА МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

## Зборнік метадычных і бібліяграфічных матэрыялаў

Рэдакцыйна-выдавецкі аддзел Кніжнай палаты БССР
пры Дзяржаўнай бібліятэцы БССР

Мінск — 1960

БА 65895 бр

ДЗЯРЖАЎНАЯ БІБЛІЯТЭКА БССР ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЦК ЛКСМ БЕЛАРУСІ

*У дапамогу масавым бібліятэкам БССР*

# ДА 40-годдзя ЛЕНІНСКАГА КАМУНІСТЫЧНАГА САЮЗА МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

Б 65895

Зборнік метадычных і бібліяграфічных матэрыялаў

Бел. аддзел 1994 г.

Рэдакцыйна-выдавецкі аддзел Кніжнай палаты БССР
пры Дзяржаўнай бібліятэцы БССР

Мінск — 1960

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя В. І. Леніна

## ЗМЕСТ


| | Стар. |
|---|---|
| Уступ | 3 |
| I. Арганізацыйная і масавая работа бібліятэк да азнаменавання 40-годдзя ЛКСМБ | 6 |
| Дадаткі | |
| Спіс літаратуры для кніжнай выстаўкі «Камсамол Беларусі — баявы атрад ВЛКСМ» (7—8 кл.) | 16 |
| Літаратура для кніжнай выстаўкі «Піянеры — змена камсамола» (4—6 кл.) | 17 |
| Матэрыялы для ранішніка «З цябе, камсамол, бярэм прыклад» (4—6 кл.) | 17 |
| Тэмы і літаратура для гучных чытанняў і гутарак | 18 |
| Вусны часопіс (6—8 кл.) | 19 |
| II. Слаўны шлях камсамола Беларусі. Рэкамендацыйны спіс літаратуры | 30 |
| Камуністычная партыя — арганізатар і кіраўнік камсамола | 30 |
| Слаўны шлях ленінскага камсамола | 34 |
| Гісторыя камсамола Беларусі | 36 |
| Гісторыя камсамола Заходняй Беларусі | 37 |
| Камсамол Беларусі ў перыяд грамадзянскай вайны | 38 |
| Камсамол Беларусі ў барацьбе за сацыялізм | 39 |
| Камсамол Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны | 40 |
| Камсамол Беларусі ў барацьбе за камунізм | 45 |
| Камуністычнае выхаванне моладзі — цэнтральная задача камсамола | 52 |
| Жыць і працаваць па-камуністычнаму | 56 |
| Камсамол у барацьбе з парушэннямі грамадскага парадку | 58 |
| Камсамол і моладзь у беларускай мастацкай літаратуры | 59 |


13


Склалі:
А. Г. Меламед, З. У. Дзяканава,
А. М. Дукор, Н. В. Каляда.
Рэдактары — Каляда Н. В.,
Петрашкевіч А. Л.
Тэхнічны рэдактар Бартман Б. І.



АТ 07562. Здана ў набор 15.VII-60 г. Падпісана да друку 20.VIII-60 г.
Тыраж 4000 экз. Папера 84 x 108 1/32. Фіз. арк. 2. Уч.-выд. арк. 3,4.
Зак. 3673. Цана 1 р. 40 к.

Мінск, друкарня „Чырвоны друкар".

## УСТУП

24 верасня 1960 года спаўняецца 40 год з дня ўтварэння Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі. Слаўны шлях барацьбы і перамог прайшоў за гэты час камсамол рэспублікі, які з'яўляецца адным з баявых атрадаў ВЛКСМ.

Камсамол рэспублікі, створаны Камуністычнай партыяй, ішоў і ідзе ў перадавых радах будаўнікоў камуністычнага грамадства. Камсамольцы Беларусі самааддана змагаліся на франтах грамадзянскай вайны і ў дні Вялікай Айчыннай вайны. За баявыя заслугі ў час Вялікай Айчыннай вайны камсамол Беларусі ўзнагароджан у 1945 годзе ордэнам Чырвонага Сцяга. Актыўна ўдзельнічаюць камсамол і моладзь у камуністычным будаўніцтве.

Цяпер Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі Беларусі аб'ядноўвае ў сваіх радах звыш 620 тысяч чалавек, якія ідуць у авангардзе беларускай моладзі. За высокае званне калектыву камуністычнай працы ў рэспубліцы спаборнічаюць звыш 7500 брыгад, змен, цэхаў і ўчасткаў. Сотні і тысячы юнакоў і дзяўчат працуюць на камсамольскіх будоўлях рэспублікі — Магілёўскім заводзе штучнага валакна, Полацкім нафтаперапрацоўчым заводзе і калійным камбінаце, Бярозаўскай ДРЭС, будаўніцтве газаправода Дашава—Мінск, Ваўкавыскім і Крычаўскім цэментавых заводах.

Слаўнымі справамі радуюць Радзіму маладыя паляводы, жывёлаводы, механізатары. Маладыя беларускія кукурузаводы сабралі ў 1959 годзе з кожнага гектара па 500 цэнтнераў зялёнай масы кукурузы з пачаткамі і заваявалі першае месца ў Савецкім Саюзе.

Камсамол Беларусі актыўна дапамагае выхоўваць тысячы маладых савецкіх патрыётаў, адданых сваёй Радзіме, Камуністычнай партыі, свайму народу.

У сваім звароце да ўсіх камсамольцаў і камсамолак, юнакоў і дзяўчат рэспублікі ЦК ЛКСМ Беларусі заклікае ўсю моладзь прыйсці да свайго 40-годдзя з новымі вытворчымі перамогамі. Уся падрыхтоўка да дастойнай сустрэчы слаўнага юбілею павінна садзейнічаць арганізацыйна-палітычнаму ўмацаванню камсамольскай арганізацыі, росту яе радоў, яшчэ больш цеснаму згуртаванню вакол Камуністычнай партыі.

Бібліятэкі разам з іншымі культурна-асветнымі ўстановамі рэспублікі павінны актыўна ўключыцца ў падрыхтоўку да 40-годдзя ЛКСМБ.

У дапамогу бібліятэкам і складзен гэты зборнік метадычных і бібліяграфічных работ.

Зборнік складаецца з дзвюх частак:

I. Арганізацыйная і масавая работа бібліятэк да азнаменавання 40-годдзя ЛКСМБ.

II. Слаўны шлях камсамола Беларусі. Рэкамендацыйны спіс літаратуры.

У першай частцы гаворыцца аб задачах бібліятэк у сувязі з падрыхтоўкай да 40-годдзя камсамола Беларусі, даюцца тэматыка картатэкі, раздзелы выстаўкі, цытаты да выставак, ілюстрацыйны матэрыял, тэмы для бібліятэчнага плаката, для лекцый, бібліяграфічных аглядаў, матэрыялы для літаратурных вечароў, гучных чытанняў, канферэнцый чытачоў. Аналагічны матэрыял змешчан і для дзіцячых і школьных бібліятэк. Акрамя таго, тут ёсць вусны часопіс «Гераічны шлях камсамола БССР», які можа быць выкарыстаны ўсімі масавымі бібліятэкамі.

Рэкамендацыйны спіс літаратуры складаецца з шасці раздзелаў.

У першым раздзеле рэкамендуюцца творы У. І. Леніна, яго саратнікаў і іншая літаратура, у якой раскрываецца значэнне камсамола як вернага памочніка і рэзерва партыі ў барацьбе за камунізм.

У другім раздзеле дадзена літаратура аб тым, як жыве і працуе савецкая моладзь, якая імкнецца з гонарам апраўдаць ускладзеныя на яе партыяй і ўсім савецкім народам высокія абавязкі.

Важнейшыя этапы пройдзенага шляху камсамолам Беларусі паказаны ў трэцім раздзеле.

У чацвёртым раздзеле паказана барацьба камсамола за пабудову камунізма на сучасным этапе.

Асобным раздзелам выдзелена літаратура аб камуністычным выхаванні моладзі (пяты раздзел), куды ўваходзіць і літаратура аб брыгадах камуністычнай працы, аб ролі камсамола ў барацьбе з парушэннямі грамадскага парадку.

Камсамол у беларускай мастацкай літаратуры паказан у шостым раздзеле.

У рэкамендацыйны спіс літаратуры ўключаны кнігі і артыкулы з часопісаў і газет, пераважна за апошнія два гады. Адбор літаратуры закончан 10 ліпеня.

Гэты спіс літаратуры прызначан для бібліятэкараў, якія павінны праводзіць вялікую работу сярод моладзі, для агітатараў і прапагандыстаў. Памянёная ў спісе літаратура можа быць выкарыстана ўсёй моладдзю.

---

## АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ І МАСАВАЯ РАБОТА БІБЛІЯТЭК ДА АЗНАМЕНАВАННЯ 40-годдзя ЛКСМБ

Вялікая ўвага ў нашай краіне ўдзяляецца ідэйнаму выхаванню моладзі. Значнае месца ў гэтай рабоце адводзіцца бібліятэкам. Прапагандуючы лепшую літаратуру, бібліятэкі ўдзельнічаюць у выхаванні моладзі і дзяцей, у павышэнні іх культурнага ўзроўню. На лепшых творах нашай літаратуры выхоўваліся і выхоўваюцца дзесяткі тысяч юнакоў і дзяўчат. Задача бібліятэк — праз кнігі дапамагчы моладзі авалодаць палітычнымі і навуковымі ведамі, лепш асвоіць сваю прафесію, азнаёміцца з перадавым вопытам у прамысловасці і сельскай гаспадарцы, глыбей пазнаць дасягненні савецкага народа ў галіне навукі, тэхнікі і культуры, шырэй азнаёміцца з творамі класікаў навукі і літаратуры, дапамагчы ў самаадукацыі. Усё гэта будзе садзейнічаць паспяховаму выкананню задач, якія стаяць перад камсамолам Беларусі. Са свайго боку камсамольцы рэспублікі, выконваючы пастанову ЦК КПСС аб паляпшэнні работы бібліятэк, аказваюць значную дапамогу бібліятэкам у перасоўнай рабоце, у арганізацыі нагляднай агітацыі, у прапагандзе літаратуры, у будаўніцтве ініцыятыўным метадам сельскіх бібліятэк.

Масавыя бібліятэкі, бібліятэкі вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў павінны да 40-годдзя камсамола Беларусі прыцягнуць да карыстання бібліятэкамі самыя шырокія колы моладзі і ў першую чаргу камсамольцаў. У справаздачным дакладзе на XXI з'ездзе ЛКСМБ адзначана, што неабходна «дабіцца, каб кожны камсамолец, кожны юнак і дзяўчына сталі актыўнымі чытачамі бібліятэк».

З мэтай прыцягнення моладзі ў лік чытачоў работнікам бібліятэк трэба наведваць прадпрыемствы, устано-

вы, калгасныя брыгады, дзе інфармаваць моладзь аб новай літаратуры, арганізоўваць гутаркі і агляды кніг. На камсамольскіх сходах і актывах трэба таксама даваць кароткія звесткі аб тым, якая паступіла новая літаратура аб камсамоле, як яе чытае моладзь, якімі кнігамі яна цікавіцца. З асаблівай увагай трэба аднесціся да прыцягнення ў лік чытачоў камсамольскага актыву.

Асаблівай увагі патрабуюць пытанні камплектавання кніжнага фонду бібліятэк літаратурай аб камсамоле і моладзі БССР. У адборы літаратуры бібліятэкам значна дапаможа штомесячны бібліяграфічны бюлетэнь «Новыя кнігі», які пачаў выходзіць з ліпеня 1960 года. Гэты бюлетэнь выдаецца Дзяржаўнай бібліятэкай БССР імя У. І. Леніна і паступае ў бібліятэкі бясплатна, з 1961 года на яго будзе аб'яўлена падпіска. У адборы кніг аб камсамоле бібліятэкам таксама дапамогуць анатаваныя карткі.

Пры правільным камплектаванні кніжных фондаў у бібліятэках павінны быць кнігі з серыі «З гісторыі камсамола Беларусі», якія выходзілі ў 1958—1959 гг. Гэтыя кнігі могуць быць шырока выкарыстаны на выстаўках, для бібліяграфічных аглядаў, гутарак, гучных чытанняў. У сувязі з 40-годдзем камсамола Беларусі Дзяржаўнае выдавецтва БССР выдасць 17 назваў кніг і брашур аб жыцці і дзейнасці камсамола і моладзі рэспублікі. Сярод іх:

1. Комсомол — нашей доблестной партии сын. Очерки по истории комсомола Белоруссии.
2. Максимов Л. Ленинский комсомол — активный помощник партии в строительстве коммунизма.
3. Анісаў С. Крутымі шляхамі.
4. Ивинский В. Комсомольцы завода автоматических линий в борьбе за использование резервов производства.
5. Гуткевіч А. і Хазанскі В. Юныя мсціўцы (П'еса).
6. Гусев А. Как повяжешь галстук — береги его.

Усе гэтыя і іншыя кнігі павінны своечасова набывацца бібліятэкамі.

Пры камплектаванні кніжнага фонду літаратурай аб камсамоле і моладзі БССР бібліятэкарам трэба раіцца з сакратарамі райкомаў, гаркомаў камсамола, з сакратарамі камсамольскіх арганізацый прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў, навучальных устаноў. Яны могуць

падказаць работнікам бібліятэк, якія кнігі трэба набыць.

Аб камсамоле Беларусі і наогул аб жыцці беларускай моладзі можна знайсці матэрыялы ў такіх часопісах і газетах, як «Маладосць», «Знамя юности», «Чырвоная змена», «Фізкультурнік Беларусі». Гэтыя часопісы і газеты павінны выкарыстоўвацца бібліятэкамі для прапаганды літаратуры аб камсамоле Беларусі.

З мэтай прасоўвання літаратуры аб камсамоле ва ўсіх масавых бібліятэках павінны быць складзены картатэкі «40 год камсамола Беларусі». Для гэтага неабходна рэгулярна распісваць указаныя вышэй часопісы і газеты.

Картатэка можа мець наступныя раздзелы:

1) Камуністычная партыя — арганізатар і кіраўнік камсамола.

2) У. І. Ленін аб камсамоле і моладзі.

3) Гісторыя камсамола БССР.

4) Баявыя справы камсамольцаў Беларусі ў Вялікай Айчыннай вайне.

5) Удзел камсамола ў сацыялістычным будаўніцтве.

6) XXI з'езд ЛКСМБ.

Пры індывідуальнай рабоце з маладымі чытачамі трэба шырока выкарыстоўваць рэкамендацыйную бібліяграфію і ў першую чаргу наступныя паказальнікі літаратуры:

1) Серыю паказальнікаў Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя У. І. Леніна «Что читать к 40-летию ВЛКСМ».

Вып. 1. Сунцова Г. М. Коммунистическая партия Советского Союза — организатор и руководитель Ленинского комсомола. М., 1958. 59 стр.

Вып. 2. Сельчук В. В. Славный путь комсомола. (Из истории ВЛКСМ). М., 1958. 118 стр.

Вып. 3. Козырев В. Н. На новые подвиги, молодежь! М., 1958. 66 стр.

Вып. 4. Дударева З. Г. Комсомол и юные пионеры, М., 1958. 86 стр.

Вып. 5. Воякина С. М. На страже мирного труда. М., 1958. 57 стр.

Вып. 6. Дударева З. Г. Каким должен быть комсомолец. М., 1958. 122 стр.

Вып. 7. Воякина С. М. За мир, дружбу и единство молодежи всех стран. М., 1958. 125 стр.

2) Жить и работать по-коммунистически. Беседы о книгах. Л., Гос. Публ. б-ка им. Салтыкова-Щедрина, 1960. 10 брошюр.

3) Кунина А. А. Героика наших дней. Рекомендательный указатель произведений советских писателей. М., 1960. 60 стр. (Гос. б-ка СССР им. В. И. Ленина).

4) Прочти эти книги, товарищ! (Аннотированный указатель). М., 1959. 64 стр. (Гос. б-ка СССР им. В. И. Ленина. В помощь бригадам коммунистического труда).

5) У дапамогу чытачу. Анатаваныя спісы літаратуры па пытаннях камуністычнай маралі і барацьбы за здаровы быт. Мінск, 1960. 39 стар. (Дзярж. б-ка БССР імя У. І. Леніна).

Для прапаганды літаратуры аб камсамоле рэспублікі ўсім бібліятэкам рэкамендуецца арганізаваць кніжную выстаўку «Слаўны шлях камсамола Беларусі». (Літаратура да выстаўкі ўказваецца ў рэкамендацыйным спісе).

Кніжная выстаўка павінна мець наступныя раздзелы:

1. Камуністычная партыя — арганізатар і кіраўнік камсамола.

2. Гісторыя камсамола Беларусі.

3. Камсамол Беларусі ў баях за Радзіму.

4. На пярэднім краі сацыялістычнага будаўніцтва.

5. Жыць і працаваць па-камуністычнаму.

6. Камсамол і моладзь у беларускай мастацкай літаратуры.

Да выстаўкі можна выкарыстаць наступныя цытаты:

«Верны ленінскім запаветам, заўсёды і ўсюды — на франтах грамадзянскай вайны і будоўлях першых пяцігодак, у суровы час Айчыннай вайны і ў пасляваенныя гады, камсамол выступаў і выступае як актыўная, стваральная сіла савецкага грамадства».

(Прывітанне ЦК КПСС да 40-годдзя ВЛКСМ).

«Як сонца, першыя ў паходзе,
Стыхіям злым наперакор,
Ішлі вы з песняй, як разводдзе,
На штурмы скал і дзікіх гор».

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя В. І. Леніна

... «Прывет вам, войска маладое,
Загартаванае ў баях!
Дарога ваша — след герояў,
Былінны эпас, зорны шлях».

**Я. Колас.**

Пажадана, каб на выстаўцы разам з кнігамі быў і ілюстрацыйны матэрыял. Напрыклад, рэпрадукцыя з карціны мастакоў Б. Іягансона і інш. . . . . .

«Выступленне У. І. Леніна на III з'ездзе камсамола» («Смена», 1958, № 6; «Огонек», 1958, № 44; «Маладосць», 1960, № 4).

Партрэт В. Харужай. У кн.: В. Хоружая «Письма на волю». Изд. 3-е. М., 1957. — «Чырвоная змена», 1960. 18 мая.

Камсамольцы — героі Беларусі. Альбом. Мінск. Дзяржвыд БССР, 1959. 39 стар. з іл.

Абаронцы Брэсцкай крэпасці. Маст. І. Ахрэмчык. — «Беларусь», 1959, № 3.

Маладыя будаўнікі Мінска. Маст. У. Стальмашонак. — «Беларусь», 1959, № 3; — «Маладосць», 1959. № 3.

Моладзь на будоўлі газаправода Дашава — Мінск (фота). — «Маладосць», 1959, № 7.

Узнятая цаліна. Маст. Ф. Малаеў. — «Маладосць». 1960, № 5.

Да трэцяга раздзела выстаўкі «Камсамол Беларусі ў баях за Радзіму» можна даць малюнак ордэна Чырвонага Сцяга з наступным тэкстам пад ім: «За баявыя заслугі ў часе Вялікай Айчыннай вайны камсамол Беларусі ў 1945 годзе ўзнагароджан Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР ордэнам Чырвонага Сцяга».

Сельскія бібліятэкі могуць даць не толькі тры раздзелы выстаўкі:

1. Камуністычная партыя — арганізатар і кіраўнік камсамола.
2. Гісторыя камсамола Беларусі.
3. Камсамол Беларусі ў камуністычным будаўніцтве Радзімы.

Акрамя выстаўкі, бібліятэкі могуць выкарыстаць і такую форму нагляднай прапаганды кнігі, як бібліятэчны плакат. Да 40-годдзя ЛКСМБ можна зрабіць плакаты прыкладна такой тэматыкі: «Камсамол — наша

доблеснай партыі сын», «Іх выхавалі камуністычная партыя і Ленінскі камсамол» (аб героях-камсамольцах Беларусі), «Што дала савецкая ўлада моладзі», «Як быў створаны камсамол Беларусі», «Жыць і працаваць па-камуністычнаму» і інш. Бібліятэчныя плакаты трэба вывешваць не толькі ў бібліятэках, але на перасоўках, у пунктах выдачы, у філіялах.

У перыяд падрыхтоўкі да слаўнага юбілею бібліятэкі могуць арганізаваць цыкл лекцый аб камсамоле: «Запаветы У. І. Леніна моладзі», «Камуністычная партыя — арганізатар і кіраўнік камсамола», «Гісторыя камсамола Беларусі», «Камсамол Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны», «Гераічныя подзвігі камсамольцаў і моладзі ў баі і ў працы», «Якім павінен быць чалавек камуністычнага грамадства», «Праца — аснова камуністычнага выхавання моладзі», «Камсамол і моладзь у барацьбе за эканомію і беражлівасць», «Правы і абавязкі членаў ВЛКСМ» і іншыя. Бібліятэкарам да кожнай лекцыі трэба падрыхтаваць па адпаведнай тэме невялікі агляд літаратуры, які праводзіцца пасля лекцыі. У канцы агляду чытачам рэкамендуецца прачытаць названыя кнігі і артыкулы.

Бібліятэкі павінны таксама правесці бібліяграфічныя агляды на тэмы: «Беларускія пісьменнікі аб камсамоле і моладзі», «Камсамол Беларусі ў радах народных мсціўцаў», «Моладзь Беларусі на камсамольскіх будоўлях рэспублікі», «Пачэсная праца сельскай моладзі БССР». Разам з іншымі культурна-асветнымі ўстановамі і камсамольскімі арганізацыямі бібліятэкам трэба правесці літаратурны вечар «40 год камсамола Беларусі». На вечары павінны быць зроблены даклад, а таксама пажадана арганізаваць некалькі выступленняў, напрыклад, члена камсамольскай арганізацыі Беларусі 1918—1920 гг. са сваімі ўспамінамі, былога камсамольца — удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, камсамольца — члена брыгады камуністычнай працы. Затым на вечары даецца мастацкая частка, асноўны матэрыял да якой можна знайсці ў зборніках:

1. **Рэпертуарны зборнік.** У дапамогу калектывам мастацкай самадзейнасці. Мінск, 1958. 138 стар. (Мінскі абл. Дом нар. творчасці).

2. **Рэпертуарны зборнік.** У дапамогу калектывам мастацкай самадзейнасці. Мінск, Дзяржвыд БССР,

1958. 88 стар. (Рэсп. Дом нар. творчасці Беларусі).

Акрамя гэтых зборнікаў, можна ўзяць вершы з газет і часопісаў, напрыклад, верш «Рапартуе камсамол» — «Чырвоная змена», 1960, 17 лютага, Грахоўскі С. — «Кранаўшчыца» — «Чырвоная змена», 1960, 8 сакавіка, і інш.

У часе падрыхтоўкі да літаратурнага вечара бібліятэкі могуць арганізаваць гучныя чытанні ў чытальных залах, на перасоўках, у інтэрнатах. Для гучных чытанняў можна ў асноўным выкарыстаць артыкулы аб камсамоле і моладзі, якія друкуюцца на працягу ўсяго 1960 года ў юнацкіх часопісах і газетах, а таксама кнігі:

1. **Кухараў С.** Незабыўныя сустрэчы. Нарысы. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1959. 136 стар.

2. **Маладыя патрыёты.** Нарысы аб падпольных камсамольскіх арганізацыях. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1958. 139 стар.

Да 40-годдзя камсамола Беларусі бібліятэкі могуць правесці канферэнцыю чытачоў на тэму «Савецкая моладзь у творах беларускіх пісьменнікаў». Абмеркаванне твораў можна правесці прыкладна па такіх пытаннях:

1. Патрыятызм, мужнасць і адданасць Радзіме савецкай моладзі.

   (Творы: Куляшоў А. — «Камсамольскі білет», Граніца», Трус П. — «Астрожнік», «Юны змаганец»).

2. Адносіны моладзі да працы.

   (Творы: Брыль Я. — «Лазунок», Карпаў У. — «За годам год», «Вясеннія ліўні», Броўка П. — «Калі зліваюцца рэкі»).

3. Імкненне моладзі да ведаў.

   (Творы: Колас Я. — «На прасторах жыцця», Карпюк А. — «У адным інстытуце»).

4. Інтэрнацыяналізм савецкай моладзі.

   (Творы: Броўка П. — Калі зліваюцца рэкі»).

5. Маральны воблік савецкай моладзі.

   (Творы: Шамякін І. — «Трывожнае шчасце», Васілёнак Я. — «Сумленнасць»).

6. Непрымірымасць моладзі да перажыткаў мінулага ў свядомасці людзей.

(Творы: Навуменка І. — «Ганьба «святога» Лукі», Чарот М. — «Кірмаш» — гл. зборнік «З цемры да святла». Мінск, 1959).

Канферэнцыю можна закончыць чытаннем верша Я. Купалы «Арлянятам» — аднаго з першых вершаў беларускай літаратуры, прысвечаных камсамолу. Пры падрыхтоўцы да канферэнцыі можна выкарыстаць наступную крытычную літаратуру:

**Вялікі песняр** беларускага народа. Збор артыкулаў аб жыцці і дзейнасці Я. Коласа. Мінск, 1959, стар. 174—178. (Аб творы «На прасторах жыцця»).

**Агеев И.** Огневые ливни над поколением. (О книге И. Шамякина «Трывожнае шчасце»). — «Советская Белоруссия», 1960, 28 февраля.

**Бачыла А.** «Граніца». Вершаваная аповесць А. Куляшова. — «Звязда», 1954, 6 жніўня.

**Жыдовіч І.** Песняр маладосці. (Аб творчасці П. Труса). — «Літаратура і мастацтва», 1959, 29 жніўня.

**Сабаленка Р.** Жыццё і песня. (Аб творчасці П. Труса). — «Полымя»,1959, № 8, стар. 158—168.

**Хведаровіч М.** Незабыўны друг. (Аб творчасці П. Труса). — «Маладосць», 1959, № 8, стар. 98—102.

**Камароўскі Я.** Раман аб дружбе народаў. (П. Броўка — «Калі зліваюцца рэкі»). — «Калгасная праўда», 1958, 26 сакавіка.

**Няхай Р.** Раман аб дружбе. (П. Броўка — «Калі зліваюцца рэкі»). — «Літаратура і мастацтва», 1957, 18 снежня.

**Герцовіч Я.** Шляхі да шчасця. (Аб рамане Ул. Карпава «За годам год»). — «Беларусь», 1958, № 1, стар. 30.

**Палітыка Д.** Раман пра людзей нашага горада. (Ул. Карпаў — «За годам год»). — «Літаратура і мастацтва», 1958, 29 студзеня.

**Хадкевіч Т.** Новая тэма, новыя героі. (Аб рамане Ул. Карпава «За годам год»). — «Полымя» 1958, № 5, стар. 177—181.

* * *

Дзіцячыя і школьныя бібліятэкі рэспублікі, працуючы з юнай зменай камсамола — піянерамі і акцябратамі, павінны шырока арганізаваць прапаганду кніг аб багатай падзеямі гісторыі камсамола рэспублікі.

Трэба паклапаціцца аб тым, каб усе піянеры і школьнікі ведалі аб гераічных подзвігах камсамольцаў у гады грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, ведалі і памяталі імёны лепшых сыноў і дачок камсамола, аддаўшых жыццё за шчасце Радзімы, ведалі аб працоўных справах камсамола, які заўсёды дапамагаў Камуністычнай партыі ажыццяўляць вялікія планы індустрыялізацыі краіны, удзельнічаў у стварэнні і ўмацаванні калгасаў; аб тым, як цяпер камсамольцы змагаюцца за пабудову камунізма, за датэрміновае выкананне сямігадовага плана.

40-годдзе ЛКСМБ бібліятэкі павінны сустрэць высокімі паказчыкамі сваёй работы. Трэба дабіцца, каб усе школьнікі ў раёне і ў вёсцы былі ахоплены бібліятэкай, каб у бібліятэках узрасла чытальнасць і абарачальнасць кніжных фондаў.

Рыхтуючыся да юбілею камсамола, бібліятэка папаўняе свой кніжны фонд новымі кнігамі аб камсамоле, якія будуць выдадзены Дзяржвыдавецтвам БССР. Трэба з дапамогай актыву чытачоў прывесці ў парадак памяшканне бібліятэкі, аформіць яго новымі матэрыяламі нагляднай прапаганды кнігі, дабіцца, каб у бібліятэцы было чыста, утульна. Бібліятэка падбірае матэрыялы і афармляе фотамантаж на тэму «Насустрач 40-годдзю камсамола Беларусі». Яна выкарыстоўвае для гэтай мэты плакаты, адкрыткі, рэпрадукцыі карцін, выразкі з газет і іншыя ілюстрацыйныя матэрыялы, афармляе альбом «Камсамолу Беларусі 40 год», выкарыстоўваючы для альбома, апрача ілюстрацыйных матэрыялаў, апавяданні, нарысы, вершы, змешчаныя ў газетах. Альбом можа мець наступныя раздзелы:

1. З гісторыі камсамола Беларусі.
2. Камсамольцы — героі Беларусі.
3. Камсамол Беларусі — актыўны будаўнік камунізма (камсамол у сямігодцы).
4. Расцём добрай зменай камсамола (аб слаўных справах юных піянераў).

Выкарыстоўваючы матэрыялы перыядычнага друку, бібліятэка складае картатэку на тэму «Што чытаць аб камсамоле Беларусі», рыхтуе выстаўку кніг для 7—8 класаў на тэму «Камсамол Беларусі — баявы атрад ВЛКСМ».

У час падрыхтоўкі да юбілею арганізуюцца агляды кніг і артыкулаў на тэмы: «Старонкі гісторыі камсамола Беларусі», «Беларускі камсамол у баях за Радзіму», «У першых радах будаўнікоў камунізма» і г. д.

Улічваючы тое, што аб камсамоле Беларусі для дзяцей ёсць абмежаваная колькасць кніг і артыкулаў, прыгодных для самастойнага чытання, бібліятэкар арганізуе гучныя чытанні і гутаркі на тэму «Будзем ведаць гісторыю камсамола рэспублікі». У бібліятэцы вывешваюцца аб'явы аб тым, калі праводзяцца чытанні (дзень, час). Рыхтуючыся да чытанняў, бібліятэкар намячае паслядоўнасць тэм для чытанняў, падбірае літаратуру, перачытвае яе, падбірае ілюстрацыйны матэрыял. Для гэтай мэты можна выкарыстаць альбом «Камсамольцы — героі Беларусі» — Мінск, Дзяржвыд. БССР, 1959, а таксама рэпрадукцыі карцін, якія змяшчаюцца ў часопісах «Маладосць», «Бярозка», «Беларусь» і інш. (Спіс літаратуры для гучных чытанняў глядзі ў дадатках).

Бібліятэкі павінны правесці работу па прыцягненню чытачоў да ўдзелу ў рэспубліканскай выстаўцы дзіцячай тэхнічнай і выяўленчай творчасці, прысвечанай 40-годдзю ЛКСМБ. Для гэтага бібліятэкі арганізуюць выстаўкі кніг у дапамогу дзіцячай тэхнічнай творчасці пад назвай «Рыхтуйцеся да рэспубліканскай выстаўкі, прысвечанай 40-годдзю ЛКСМБ».

Дзіцячыя бібліятэкі павінны арганізаваць сустрэчы чытачоў з першымі камсамольцамі — удзельнікамі грамадзянскай вайны, камсамольцамі — удзельнікамі сацыялістычнага будаўніцтва першых пяцігодак, з камсамольцамі — перадавікамі прамысловасці і сельскай гаспадаркі раёна, з камсамольцамі — членамі брыгад камуністычнай працы.

Юбілейныя вечары, ранішнікі, вусныя часопісы могуць быць праведзены бібліятэкамі па наступных тэмах: 1. Іх выхаваў камсамол (камсамольцы—героі Беларусі) 2. Камсамол у беларускай паэзіі. 3. Быць камсамольцам імкніся, піянер. 4. Піянеры — змена камсамола.

Бібліятэкары павінны паклапаціцца аб тым, каб праграмы вечароў былі цікавыя і разнастайныя па зместу. Для гэтага трэба дамовіцца са школай, клубам, каб у вечары прымалі ўдзел не толькі чытальнікі і дэкламатары, але і хор, танцавальныя калектывы, спартсмены

Ад уласнай ініцыятывы, творчай выдумкі бібліятэкараў залежаць цікавасць і змястоўнасць мерапрыемстваў, прысвечаных 40-годдзю ЛКСМБ.

## ДАДАТКІ

### Спіс літаратуры для кніжнай выстаўкі «Камсамол Беларусі — баявы атрад ВЛКСМ» (7—8 кл.)

**Ленин В. И.** Задачи союзов молодежи. М., «Молодая гвардия», 1954. 48 стр.

**Ленин В. И.** О молодежи. М., «Молодая гвардия», 1956. 319 стр.

**Хрущев Н. С.** Воспитывать активных и сознательных строителей коммунистического общества. М., «Молодая гвардия», 1958. 32 стр.

**Губараў В.** Піянерам аб камсамоле. Мінск, Дзяржвыд. БССР, 1958. 84 стр.

**Безыменский А.** На первых съездах комсомола. М., Детгиз, 1957. 48 стр.

**Аблова Р.** Это было в Белоруссии. М., «Молодая гвардия», 1957. 192 стр.

**Вечно живые.** М., «Молодая гвардия», 1958. 252 стр.

**Гневко В.** и **Каменская Н.** Комсомол Белоруссии в период гражданской войны. Минск, Учпедгиз БССР, 1958. 79 стр.

**Жураў А.** Як быў створаны камсамол Беларусі. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1958. 51 стар.

**Маладыя патрыёты.** Нарысы аб падпольных камсамольскіх арганізацыях. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1958. 139 стар.

**Мы — молодая гвардия.** Избранные произведения о комсомоле. М., Детгиз, 1958. 439 стр.

**Николаев В.** и **Щербаков А.** Когда смерть не страшна. М., «Молодая гвардия», 1958. 111 стр.

**Твой старший товарищ.** Сборник. М., «Молодая гвардия», 1958. 206 стр.

**Хоружая В.** Письма на волю. М., «Молодая гвардия», 1957. 101 стр.

**Шымук В.** Каля Броннай гары. Паэма. Мінск, Дзяржвыд. БССР, 1960. 32 стар. з іл.

**Шчарбатаў Г.** Камсамол Беларусі ў баях за Радзіму. Мінск. Дзяржвыд БССР, 1957. 84 стар.

## Літаратура для кніжнай выстаўкі «Піянеры — змена камсамола» (4—6 кл.)

**Губараў В.** Піянерам аб камсамоле. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1958. 84 стар.

**Гусев А.** Как повяжешь галстук — береги его. М., «Молодая гвардия», 1957. 142 стр.

**Так поступают пионеры.** Правдивые рассказы о пионерских делах. М., Детгиз, 1958. 224 стр.

**Хотиловская Л.** Пионер — ребятам пример. М., «Молодая гвардия», 1959. 60 стр.

**Советской страны пионер.** Рассказы. М., Детгиз, 1959. 589 стр.

**Никогда** не забудем. Рассказы белорусских ребят о днях Великой Отечественной войны. Минск, Госиздат БССР, 1959. 251 стр.

**Агняцвет Э.** Песня пра піянерскі сцяг. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1949. 21 стар.

**Якімовіч А.** Я — юны піянер. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1952. 99 стар.

**Танк М.** Урачыстае абяцанне. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1949. 72 стар.

Апрача ўказанай літаратуры, на выстаўку ставяцца кнігі серыі «Піянерскія законы» і кнігі аб піянерах-героях.

## Матэрыялы для ранішніка «З цябе, камсамол, бярэм прыклад» (4—6 кл.)

**Гілевіч Н.** Мой брат. Верш. — «Бярозка», 1959, № 14, стар. 29.

**Астрэйка А.** Мой брат — камсамолец. У кн.: Астрэйка А. Зямля мая. Мінск, 1959, стар. 381—382.

**Грахоўскі С.** Камсамол. — «Бярозка», 1958, № 10, стар. 2.

**Вялюгін А.** Мой старэйшы брат. У кн.: Вялюгін А. На подступах. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1952, стар. 302—304.

**Вольскі А.** Арляняты. — «Піянер Беларусі», 1960, 10 чэрвеня.

**Кірэенка К.** Кім мы будзем. — «Бярозка», 1958, № 10, стар. 8.

**Кірэенка К.** Песня пра мару (мастацкае чытанне).— «Бярозка», 1959, № 9, стар. 8—9.

**Грахоўскі С.** Ідзе атрад па Беларусі (мастацкае чытанне). — «Бярозка», 1959, № 9, стар. 6—8.

**Істомін В.** Мы на змену ідзем. Словы С. Шушкевіча. — «Чырвоная змена», 1960, 1 мая.

**Пукст Р.** Песня юных разведчыкаў. Словы А. Вольскага. — «Піянер Беларусі», 1960, 4 лютага.

**Шнейдэрман М.** Мы дзеці вялікай Айчыны. Словы М. Гамолкі. — «Бярозка», 1959, № 10, 2 с. вокладкі.

**Пукст Р.** Песня пра Марата Казея. Словы А. Вольскага. — «Бярозка», 1959, № 3, 2 с. вокладкі.

## ТЭМЫ І ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ГУЧНЫХ ЧЫТАННЯЎ І ГУТАРАК

Тэма. 1. З гісторыі камсамола Беларусі.

**Журов А.** Они были первыми. Беседа 1. (Из летописи комсомола Белоруссии). — «Зорька», 1958,15 января.

**Журов А.** Проба огнем. Беседа 2. (Из летописи комсомола Белоруссии). — «Зорька», 1958, 18 января.

**Журов А.** Ударная бригада. Беседа 3. (Из летописи комсомола Белоруссии). — «Зорька», 1958, 25 января.

**Журов А.** В боях за Родину. Беседа 4. (Из летописи комсомола Белоруссии). — «Зорька», 1958, 1 февраля.

**Синевич Н.** Битва за хлеб. Беседа 5. (Из летописи комсомола Белоруссии). — «Зорька», 1958, 9 февраля.

**Рубинштейн И.** Этих дней не забыть. Первая комсомольская организация Белоруссии. — «Знамя юности», 1960, 25 марта.

Тэма 2. Іх выхавала Камуністычная партыя і камсамол

**Камсамольцы** — героі Беларусі. (Альбом). Мінск, Дзяржвыд БССР, 1959. 39 стар.

**Усціновіч І.** А песню сябры даспяваюць. — «Піянер Беларусі», 1960, 1 чэрвеня.

**Ходзіць слава пра Чуклая.** — «Піянер Беларусі». 1960, 18 сакавіка.

**Имени Ивана Чуклая.** — «Зорька», 1960, 25 июня.

**Курто Е.** Во имя будущего. — «Зорька», 1960, 18 июня.

**Курто Я.** Вечна ў страі. (П. Купрыянаў). — «Бярозка», 1958, № 10, стар. 6—7.

**Рунец П.** Партызанская разведчыца. (Л. Чалаўская). — «Бярозка», 1958, № 10, стар. 7—8.

**Няхай Р.** Першыя зоркі. (Аб скідзельскіх камсамольцах). — «Полымя», 1958, № 10, стар. 148—155.

**Чапрасаў М.** Камсамольскі білет нумар 12261192. — «Маладосць», 1958, № 8, стар. 126—128.

**Суша М.** Подзвіг Хвядоса Смалячкова. — «Маладосць», 1958, № 8, стар. 129—130.

**Бычкоўскі П.** Успаміны аб Веры Харужай. — «Беларусь», 1957, № 3, стар. 25.

**Галінін Л.** Ён змагаўся ў Гомелі. (А. Ісачанка). — «Маладосць», 1958, № 10, стар. 114—116.

**Камсамольцы-партызаны** Беларусі — Героі Савецкага Саюза. — «Блакнот агітатара», 1958, № 28, стар. 20. (Для бібліятэкараў).

**Коммунист и борец.** (В. З. Хоружая). — «Зорька», 1960, 21 мая.

**Собаль Я.** Гераіня беларускага народа. (В. З. Харужая). — «Бярозка», 1960, № 6, стар. 11—13.

Тэма 3. **«Мы сёння ў першых радах».**

**Броўка П.** Камсамольскія сэрцы. — «Маладосць», 1958, № 10, стар. 15—17.

**Белорусская соль.** — «Зорька», 1960, 11 июля.

**Наша школа** — говорят рабочие. — «Зорька», 1960, 19 мая.

**Гілевіч Н.** Не дазволім! — «Піянер Беларусі», 1960, 20 мая.

**Грахоўскі С.** Малады рабочы клас. — «Бярозка», 1959, № 7, стар. 5—6.

У спіс літаратуры для гучных чытанняў і гутарак таксама павінны ўключацца новыя матэрыялы з перыядычнага друку.

## Вусны часопіс (6—8 кл.)

«Гераічны шлях камсамола Беларусі»

**1-я старонка — «Яны былі першымі».**

Музыка іграе гімн БССР.

Вядучы:

24 верасня Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі Беларусі адзначае 40 год свайго існавання.

Першыя камсамольскія арганізацыі ў Беларусі былі створаны летам і восенню 1918 года.

Б 65895

Дзяржаўная бібліятэка імя В. І. Леніна

У суровыя гады грамадзянскай вайны большасць беларускіх камсамольцаў пайшла на фронт і ў партызанскія атрады, каб са зброяй у руках абараняць ад ворагаў сваю Савецкую Радзіму.

1 чытальнік

Рос ты ў дні суровага змагання,
Партыі памочнік баявы.
Для народа сонечнае ранне
Здабываў у дыме франтавым.

2 чытальнік

Малады ад роднага парога
Апрануў тады стары шынель
І пайшоў ваенную дарогай,
Дзе свісталі кулі і шрапнель.

(С. Кацуба. Ленінскаму камсамолу. «Чырвоная змена», 1958, 29 кастрычніка).

Вядучы

Андрэй Блажко, Іван Муры, Васіль Падбярэзны, Піня Залоцін і сотні іншых маладых змагароў за Савецкую Радзіму праславілі сваімі неўміручымі подзвігамі камсамол Беларусі ў гады грамадзянскай вайны.

3 чытальнік

Ляцелі тачанкі ў пыле і дыме,
Блішчалі на сонцы клінкі.
Дзяўчаты, абрэзаўшы спелыя косы,
Узяўшы з сабой камсамольскі білет,
Праз попел, пажары, праклёны, пагрозы
Ішлі за байцамі ўслед.

4 чытальнік

На піках гарэлі чырвоныя сцягі,
Па белых страчыў кулямёт,
Каня на Дняпры асядлаўшы, Карчагін
Ля Спаска закончыў паход.

(С. Грахоўскі. «Камсамол». — «Бярозка», 1958, № 10).

**2 старонка — «Гады сацыялістычнага будаўніцтва»**

Вядучы

Скончылася грамадзянская вайна. Камсамол Беларусі вырас у шматтысячную ўдарную брыгаду будаўнікоў сацыялізма.

5 чытальнік

Адгрымелі громы. Ясны ранак.
Сонца праўды азарыла дол.
Выйшаў ты з баёў загартаваны
Ленінскі адважны камсамол.

Крок у крок за партыяй любімай
З песняй звонкай, як малодшы брат,
Ты ішоў па сонечнай краіне
Будаваць савецкі новы лад.

6 чытальнік

Ты ўзводзіў фабрыкі, заводы,
Дзе спрадвеку чахлі пустыры,
На будоўлях слаўных пяцігодак
Закладаў трывалыя муры.

(С. Кацуба. «Ленінскаму камсамолу» — «Чырвоная змена», 1958, 29 кастрычніка).

Вядучы

Усюды, дзе былі неабходны маладыя працоўныя рукі, ішлі камсамольцы: на Асінторф, на ўзвядзенне Бел. ДРЭС, на асушэнне палескіх балот. «Гомсельмаш», Аршанскі ільнокамбінат, віцебская фабрыка «КІМ» і дзесяткі іншых фабрык і заводаў у Беларусі былі пабудаваны пры актыўным удзеле камсамольцаў і моладзі. Камсамол Беларусі прымаў таксама ўдзел і ва ўзвядзенні буйных аб'ектаў ва ўсіх кутках нашай неабсяжнай Радзімы.

7 чытальнік

Палатка ў Сібіры, тайга на Амуры
Нам бацькавай хатай была.
Мы ставілі домны на дымным Урале,
Ішлі на Данец, на Амур і Табол,
Бо кожнага сэрца туды пасылала,
Куды заклікаў камсамол.

(С. Грахоўскі. Камсамол. — «Бярозка», 1958, № 10).

## 3-я старонка — «Вялікая Айчынная вайна»

Вядучы

1941 год. Фашысты напалі на нашу Радзіму. Уся савецкая моладзь па заклiку партыі ўзнялася на барацьб

бу. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў тыле ворага камсамольцы і моладзь праявілі ўзоры мужнасці, геройства і адвагі.

8 чытальнік

А калі над нашым мірным краем,
Нібы ноч навіслі груганы,
Выйшлі ў бой з фашысцкай чорнай зграяй
Камсамола верныя сыны.

9 чытальнік

Ішла ў разведку Партнова смела.
Танкам шлях загарадзіў Клачкоў,
Бомбы сыпаў Мікалай Гастэла
І дружыў з вінтоўкай Смалячкоў.

(С. Кацуба. «Ленінскаму камсамолу». — «Чырвоная змена», 1958, 29 кастрычніка).

Вядучы

Навекі ўвойдуць у гісторыю баявыя справы камсамольцаў-падпольшчыкаў Мінска, Гомеля, Жлобіна, Оршы, Скідзеля і іншых гарадоў і вёсак Беларусі.

10 чытальнік

З адхонаў ляцелі фашысцкія танкі,
За Обалем, Оршай гарэлі масты,
І маці-Радзіма дачку-партызанку
Вяла па балоце, па лесе густым.
Вяла асцярожна па пушчы сасновай,
Па горных выгарах, па чэзлай лазе,
На змену Чалоўскай, на змену Партновай
З гранатай узняўся маленькі Казей.
Хлапцы і дзяўчаты худымі рукамі
Масцілі дарогі, закладвалі тол—
І радасць, і шчасце, і гора з бацькамі

Усе чытальнікі

Заўсёды дзяліў камсамол...

(С. Грахоўскі. Камсамол. — «Бярозка», 1958, № 10).

Вядучы

Неўміручую славу заваявалі сабе героі Обальскай падпольнай камсамольскай арганізацыі, якой кіравала Ефрасіння Зянькова — цяпер Герой Савецкага Саюза

Выконваецца «Песня аб юных мсціўцах».

У квітнеючай Обалі,
Над маленькаю рэчкай
Спіць таполя высокая —
Партызанскія стрэчы.

Як паклікала партыя,
І па мудраму слову
Камсамольскую гвардыю
Тут збірала Зянькова.

Не ляснымі крыніцамі
Мора гневу пачата,
Сталі юнымі мсціўцамі
Юнакі і дзяўчаты.

Мост пад ворагам рушыцца,
Вадакачка ў дыме.
Так крывёю і мужнасцю
Здан экзамен Радзіме.

Вядучы

Камсамольска-маладзёжныя дыверсійныя групы спусцілі пад адхон сотні варожых эшалонаў. Па 27 эшалонаў падарвалі камсамольцы Павел Кажушка, Фёдар Кухараў. 29 эшалонаў спусціў пад адхон Піліп Кавалёў. Камсамольцы-падрыўнікі не шкадавалі жыцця, каб знішчыць як мага больш фашыстаў. У 1943 годзе камсамольцы Звераў і Казятнікаў кінуліся з зарадамі толу пад варожы эшалон з танкамі. У 1944 годзе іх подзвіг паўтарыў брэсцкі шаснаццацігадовы камсамолец-партызан Мікалай Гойшык.

1 чытальнік

Усім да палатна нам не прабрацца, —
Варта можа нас пераstраляць.
Поезд жа павінен тут застацца,
Мы яго павінны ўзарваць.

2 чытальнік

Ціха так прамовіў свае слова
К партызанам іхні камандзір...

3 чытальнік

— Я пайду, — сказаў тады Мікола, —
Мне дазвольце, я ўзарву адзін...

1 чытальнік

...Кожны кусцік быў яго аховай,
Купіна, лагчына і равок.
Усё нібы шаптала да Міколы:
— Ворагу не выдадзім, сынок.

2 чытальнік

Прапаўзе з мінуту. Зноўку светла,
І хлапец зліваецца з зямлёй.
А ракеты, яркія ракеты
Усё часцей над Броннаю гарой.
Да чыгункі можа крокаў з дзвяццаць,
Вось-вось поезд к фронту прабяжыць.

3 чытальнік

Трэба ж падымацца, паспяшацца,
Трэба ж міну неяк падлажыць!
Эшалон прарвацца не павінен,
Ён жа смерць вязе туды, на ўсход...
Я ж пакляўся верным быць краіне,
Я ж твой сын, любімы мой народ.

1 чытальнік

Зноў ракета. А з-за павароту
Ужо чутны перастук калёс.
Б'ецца сэрца. Твар у кроплях поту.

3 чытальнік

«Не паспею...»
І ва ўвесь свой рост
Выпраміўся і, нібы маланка,
К насыпу ён з мінаю ляціць.
«Не паспею...»
І пад поезд з танкамі
Кідаецца Коля на пуці...

1 чытальнік

Выбух... Скрыгат. У агні барвовым
Крык фашыстаў, енкі, сполах, стогн.

У с е ч ы т а л ь н і к і

Мужны сын Радзімы, камсамола
Ўзарваў апошні эшалон.

(З паэмы В. Шымука «Каля Броннай гары», Мінск, 1960).

В я д у ч ы

За мужнасць, самаадданасць і геройства, праяўленыя камсамольцамі і моладдзю Беларусі ў радах Чырвонай Арміі і партызанскіх атрадах у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, 22 верасня 1945 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета Саюза ССР узнагародзіў камсамол Беларусі ордэнам Чырвонага Сцяга. Звыш 30 тысяч камсамольцаў і маладых партызан за гераізм, праяўлены ў баях з фашыстамі, былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, а 24 самым мужным маладым патрыётам прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

Выконваецца песня «К а м с а м о л ь ц а м Б е л а р у с і», **музыка А. Туранкова, словы П. Броўкі** («Літаратура і мастацтва», 1958, 29 кастрычніка).

Вы маці-Радзіме ўсім сэрцам аддany,
Прайшлі гераічны праслаўлены шлях.
Сябе вы адзначылі працай стараннай
І гордым бястрашшам у грозных баях.

Вы, моцныя духам, ваш гарт бальшавіцкі,
Вы разам з бацькамі ішлі, змагары;
Народ не забудзе, як Міша Сільніцкі
Зямлю ад навалы грудзямі прыкрыў.

У дні непагоды, ў паходах суровых,
У бітвах юнацкая слава расла.
Народ не забудзе, як Рыма Шаршнёва
За край свой любімы жыццё аддала.

Народ не забудзе ніколі герояў,
Іх спраў неўміручых у часінах цяжкіх.
Усталі з вас волаты Лаўскага бою
І смерцю сваёй ратавалі жывых.

Калі ж на прасторы прышла перамога
І сонечны дзень над краінай узышоў
Мы бачылі вас мужных на новых дарогах,
На ўсіх рыштаваннях вялікіх будоў.

### 4 старонка — «Пасляваеннае аднаўленне народнай гаспадаркі»

Вядучы

У пасляваенныя гады камсамол па закліку Камуністычнай партыі ўсю энергію і энтузіязм моладзі накіраваў на выкананне задач аднаўлення і далейшага развіцця народнай гаспадаркі. Больш як 30 тысяч маладых беларускіх патрыётаў па пуцёўках камсамола прыйшлі аднаўляць Мінск, Віцебск, Гомель і іншыя гарады рэспублікі. Звыш 5 тысяч камсамольцаў узводзілі цэхі трактарнага і аўтамабільнага заводаў.

2 чытальнік

І там, дзе нядаўна дымілі пажары, —
Знікаюць зусім разбурэнняў сляды,
Працуем, мужнеем для славы Радзімы,
Каб рос дабрабыт з кожным годам і днём.
Шляхі нашы просты, жаданні няхітры:
Каб наша на радасць квітнела зямля,
Каб мірная праца была сакавітай
Пад промнямі яснымі зораў Крэмля.

(М. Васілёк. «Дзе нядаўна дымілі пажары».
У кн.: М. Васілёк. Выбраныя вершы.
Мінск, 1950).

Вядучы

Звыш 60 тысяч камсамольцаў і моладзі Беларусі асвойвалі цалінныя і абложныя землі. Дзесяткі тысяч маладых патрыётаў рэспублікі прымалі ўдзел ва ўборцы ўраджаю на палях Казахстана і Алтая. 21 тысяча камсамольцаў Беларусі працуе цяпер на новабудоўлях Сібіры і Поўначы.

4 чытальнік

Паглядзі, юны друг,
Навакол,
Як працуе
Маё пакаленне.

Яно ехала
Першым у стэп
Па цалінных прасторах
Алтая,
Пачынала там бітву
За хлеб
Камсамольцаў сям'я
Маладая.

5 ч ы т а л ь н і к

А як партыя
Лозунг дала:
У Сібір, камсамол,
На будоўлі!..
Маладосць мая
Дружна пайшла,
Каб раслі карпусы
І дыміліся домны,
Экскаватары
Рылі зямлю,
Угрызаліся
У мёртвыя нетры.

(Я. Лукашэвіч. «Маё пакаленне». — «Мінская праўда», 1958, 29 кастрычніка).

Выконваецца песня «Е д з е м о л а д з ь Б е л а р у с і», словы Ваўчкова, музыка Г. Гапонава («Мінская праўда», 1958, 25 ліпеня).

З Мінска, Гомеля, Бабруйска,
З Мазыра ў далёкі край
Едзе моладзь Беларусі
У Казахстан і на Алтай.
Адгукнуліся на заклік
Роднай партыі сыны, —
Каб жыццё крыніцай біла
На прасторах цаліны.

Камсамольцы-арляняты,
Пасланцы народных мас,
Едуць працаю заўзятай
Камунізма блізіць час.
Каб на залежных абшарах
Загудзелі трактары.
І, як мора, заіграла
Там пшаніца на зары.

## 5 старонка — «Па шляху да камунізма»

В я д у ч ы

